**Мікалаева Л.В.**
кандыдат гістарычных навук, дацэнт
Установа адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі"
г. Мінск, Беларусь

# ЦІКАВЫЯ ЗВЕСТКІ З ГІСТОРЫІ БРАСЛАЎСКАГА ПАВЕТА КАНЦА XV – ПЕРШАЙ ПАЛОВЫ XVI СТ. У КНІЗЕ МЕТРЫКІ ВКЛ № 560

Час уваходжання беларускіх зямель у склад Вялікага Княства Літоўскага (далей – ВКЛ) складае значны перыяд у нашай айчыннннай гісторыі. Як паўнапраўны суб'ект міжнародных адносін, ВКЛ на працягу свайго самастойнага існавання праводзіла ўласную ўнутраную і знешнюю палітыку. Іх эфектыўнасць, асабліва апошняй, непасрэдным чынам аказвала ўплыў на жыццё жыхароў памежных рэгіёнаў, адным з якіх быў Браслаўскі павет.

Як частка Віленскага ваяводства Браслаўскі павет пачаў згадвацца з пачатку XV ст. З'яўляючыся буйным дзяржаўным уладаннем, у пісьмовых крыніцах ён упамінаўся пад раўназначнымі назвамі "павет", "намесніцтва", "дзяржава", "староства". Размяшчэнне ж яго на мяжы ВКЛ з Лівонскай канфедэрацыяй прыўносіла свае спецыфічныя адметнасці ў побыт мясцовага насельніцтва.

Зразумела, што памежнае геаграфічнае знаходжанне заўсёды накладала адбітак на паўсядзённае жыццё мяшканцаў пагранічча. Як вядома, тэрыторыя з'ўлялася і з'яўляецца адным з важнейшых атрыбутаў дзяржавы. Таму справа дэлімітацыі і дэмаркацыі дзяржаўных межаў ператваралася ў адно з найбольш актуальных і надзённых пытанняў. Правядзенне азначаных працэдур у ранненавачасны перыяд і характар удзелу ў іх жыхароў літвінска- лівонскага пагранічча можа быць паспяхова рэканструявана на падставе дадзеных Кнігі № 560 Метрыкі ВКЛ.

У наш час Кніга № 560 захоўваецца ў Расійскім дзяржаўным архіве старажытных актаў у Маскве [3]. Для падрыхтоўкі прыведзенага ніжэй матэрыяла намі была выкарыстана фільмакопія Кнігі № 560, якая ўтрымліваецца ў Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі ў Мінску [2], а таксама другое яе выданне, падрыхтаванае і ажыццёўленае ў 2010 г. А.І. Дзярновічам [1]. З-за большай даступнасці апошняй для чытача спасылкі ў тэксце зроблены на публікацыю.

Змест Кнігі № 560 тэматычна аднародны і цалкам прысвечаны справам мяжы паміж ВКЛ і Лівонскай канфедэрацыяй. У наш час яе матэрыялы вядомы толькі ў складзе кнігі-копіі, зробленай, верагодна, у канцы XVI ст. па распараджэнні канцлера ВКЛ Льва Сапегі па прычыне абвятшаласці арыгінала [1, с. 9]. Структурна Кніга № 560 складаецца з акта дэмаркацыі мяжы паміж ВКЛ і Лівоніяй, ажыццёўленай ў 1542 г. (з устаўкай фрагмента акта дэмаркацыі 1541 г., якая не была скончана [1, с. 59 – 60]) [1, с. 51 – 84] і запісаў скаргаў жыхароў ВКЛ на дзеянні памежнай адміністрацыі і жыхароў Лівоніі [1, с. 85 – 121].

У гэтай сувязі звяртае на сябе ўвагу пачатковая частка акта дэмаркацыі. У ёй паведамляецца, што кароль польскі і вялікі князь літоўскі Жыгімонт Казіміравіч накіраваў сваіх гападарскіх пасланцаў Івана Глебавіча Корсака і Яна Кміту Сакаловіча, каб яны “границы пописовали стародавъныи пана Радзивиловы долъгость и широкость, как долъго и широко Нε мцы забрали зε мъли г(о)с(по)д(а)ра Королѩ Его м(и)л(о)сти, зε мълями пана Мистра Лиѳ лѩ нтъского почонъшы ѡтъ ѡзε ра Кѵ рчомъ, аж до границъ Московъских” [1, с. 51]. Такім чынам, тут вызначана прычына ажыццяўлення азначанага мерапрыемства – парушэнне лівонскім бокам граніц, зафіксаваных яшчэ ў 1473 г. камісіяй, якую з боку ВКЛ узначальваў троцкі ваявода і маршалак земскі пан Радзівіл Осцікавіч.

У Кнізе № 560 прыводзіцца дастаткова падрабязнае апісанне працэдуры дэмаркацыі. Ёй папярэднічаў абмен пасольствамі, праз якія вызначаўся дзень сустрэчы памежных камісараў. У 1542 г. сустрэча камісараў павінна была адбыцца 20 студзеня, але з-за спазнення лівонскіх прадстаўнікоў адбылася на дзень пазней [1, с. 60 – 61]. Традыцыйным месцам іх спаткання і пачатковай кропкай усіх дэмаркацый XV – XVI ст. было возера Курчмы (Курцум, зараз на тэрыторыі Даўгаўпілскага павета Латвійскай Рэспублікі) [1, с. 51, 60, 61].

Пасля сустрэчы камісараў адбывалася ўзгадненне спосабаў і метадаў ажыццяўлення дэмаркацыі. Літвінскія камісары імкнуліся прытрымлівацца усталяваных папярэдне межаў (у 1542 г. – Радзівілавых граніц 1473 г.), у адшуканні якіх у якасці праваднікоў традыцыйна выступалі мясцовыя жыхары ВКЛ. Гэта запісвалася ў спецыяльных ідэнтычных па змесце актах, якія атрымлівалі абодва бакі [1, с. 61]. У далейшым камісары ВКЛ і Лівоніі дзяліліся на дзве групы з аднолькавай колькасцю ўдзельнікаў ад абодвух бакоў, якія разыходзіліся на ўсход (да маскоўскай мяжы) і на захад (да Балтыйскага мора) ад возера Курчума [1, с. 62].

Пры ажыццяўленні далейшай працэдуры дэмаркацыі вялікую ролю ігралі інструкцыі кіраўнікоў дзяржаў, ад дакладнасці і паўнаты якіх залежала паспяховасць ўсіх прызначаных мерапрыемстваў. У адваротным выпадку ўзнікалі цяжкасці ў працэсе дэмаркацыі, а часам нават прыпынялася сама працэдура, як гэта і адбылося ў 1542 г., калі лівонскім камісарам спатрэбілася дадатковая інструкцыя свайго магістра [1, с. 62 – 63].

Падчас правядзення дэмаркацыі перыядычна ўзнікалі спрэчныя сітуацыі, звязаныя альбо са знікненнем старых знакаў, пазначаўшых граніцу ў 1473 г., альбо з прадстаўленнем лівонскімі камісарамі супярэчлівай па змесце інфармацыі. Не заўсёды існавала ўзгодненасць і ў пытаннях інтэрпрэтацыі таго ці іншага знака. У сувязі з гэтым узрастала важнасць паказанняў староннніх, а не афіцыйных сведкаў – мясцовых жыхароў, якія мелі інфармацыю пра пазнакі мяжы. У такой якасці звычайна прыцягвалі “свε тъковъ добрых, людε й старых, вε ры годных” [1, с. 68, 75]. Часам гэта былі людзі вельмі сталага веку, “которых на возех вывозили до насъ, которие нε могли ходить…” [1, с. 68]. Цікава, што некаторыя са сведкаў яшчэ ў дзіцячым узросце ўдзельнічалі ў размежаванні Радзівіла, аб чым паведамілі новым камісарам у 1542 г. дрысвяцкія сведкі: “Мы памε таε мъ, коли панъ Радивилъ ε здилъ и граничилъ

з немъцы за Его м(и)л(о)сти Королѧ Казимира. В тотъ часъ ѡтъцове наши εздили с паномъ Радивиломъ, и насъ в тотъ часъ, дεтε й своих, зъ собою брали. И тотъ εздъ памεтаεмъ, и границꙋ пана Радивиловꙋ …” [1, с. 76]. Такім чынам, можна меркаваць, што сведкаў па памежных справах рыхтавалі загадзя і ўдзел у справе дэмаркацыі дзяцей меў на ўвазе іх далейшае прыцягненне да падобных працэдур у дарослым і яшчэ больш сталым узросце. Спецыфічнай асаблівасцю з’яўляецца і тое, што літвінска-лівонская мяжа, акрэсленая тагачаснымі камісарамі, пратрывала стагоддзямі і ў наш час шмат у чым супадае з лініяй мяжы Рэспублікі Беларусь з Латвійскай Рэспублікай.

Прыкладна палову аб’ёму зместу Кнігі № 560 займаюць запісы скаргаў памежных жыхароў ВКЛ [1, с. 85 – 121]. У ліку апошніх пераважалі скаргі жыхароў Браслаўскага павета [1, с. 90 – 121], сярод якіх асобна пазначаны скаргі насельніцтва Дрысвяцкай і Друйскай валасцей. Пры гэтым у дачыненні да Дрысвяцкай часткі ў тэксце ў аднолькавым значэнні выкарыстоўваліся пазначэнні “павет” і “воласць” [1, с. 71, 90], у той час як Друйская воласць адназначна называлася часткай Браслаўскага павета [1, с. 97]. Тэрыторыя Браслаўшчыны, верагодна, успрымалася як у шырокім значэнні як “павет”, так і ў вузкім значэнні – як “воласць” [1, с. 100].

Камісары ВКЛ старанна апытвалі сведкаў, збіралі і фіксавалі інфармацыю аб злоўжываннях і парушэннях заканадаўства памежным насельніцтвам і прадстаўнікамі адміністрацыі Лівоніі. Асабліва шмат скаргаў было на агрэсіўныя дзеянні “кꙋнътора Невъгиньског(о)” (комтура Дынабурга). Мяруючы па дадзеных Кніі № 560, на гэтай пасадзе напярэдадні і падчас правядзення дэмаркацыі найбольш вызначыліся сваімі наездамі “кꙋнътор Рꙋдой” Генрых Плятэр (1513 – 1525) [1, с. 219] і “кꙋнътор Вилимъ” Вільгельм фон Фюрстэнберг (1535 – 1554) [1, с. 226] і іх падначаленыя. Змест скаргаў уніфікаваны ў адпаведнасці з пратаколам і ўтрымлівае інфармацыю пра злачынствы лівонскіх прадстаўнікоў і пералік паграбленай маёмасці. Так, напрыклад, у Аўрама Шуркавіча людзі “кꙋнътора Рꙋдого” пасля наезду забралі 30 коней, 6 коп грошай, 30 авечак, 150 локцяў белага палатна, пастаў англійскага сукна і жаночае футра з вавёркі. Сам наезд адбыўся за 20 гадоў да дэмаркацыйных мерапрыемстваў [1, с. 95]. А ў зямяніна Грышкі Шэмбеля забралі 5 коней коштам па 10 коп грошай кожны, 11 кабыл, 4 супольных збрэй, 9 сёдлаў, 2 шубы – з куніцы і лісы (апошняя была пакрыта пурпурным сукном), 2 кафтаны, 100 коп грошай, 2 жаночыя вавёркавыя футры, крытыя кітайкай, каўнер і галаўны ўбор, упрыгожаныя перлінамі, 2 пурпурныя сукенкі, 5 алавяных місаў, 2 алавяныя бідоны, 50 галоў рагатай жывёлы і 120 авечак. Адбыўся наезд таксама 20 гадоў таму [1, с. 95 – 96]. Акрамя шматлікіх пакраж грошай, маёмасці і свойскай жывёлы (коней, кароў, авечак, свіней і г.д.) і птушкі, падпалаў сядзіб скаргі фіксуюць і больш цяжкія злачынствы лівонскіх падданых, у першую чаргу забойствы памежных літвінскіх жыхароў, а таксама захопы літвінскіх палонных і вывад іх на тэрыторыю Лівоніі. Так, напрыклад, “нεмъцы, наεхавъшы на Снεшъковъ домъ и на братанича, εго статок вεсь выбрали и домъ сожгли, а того Снεшъка и братанича εго до смεрти забили, Снεшъка забили самопѧ того, а Пεтъра забили само чεтьвεртого и з сεмъεю

их, а Богдана забили самопѧ того, а Ѡ нъдрꙋ шовꙋ жонꙋ забили самопѧ тую и з дє тьми их. Тых всих побитых двадцать головъ и чотыры, а Ѧ нъка забили самопѧ того, а статок побрали их, а домы их пожгли. А томꙋ лє тъ тридцать" [1, с. 118 – 119]. "А к томꙋ тотъ жє кꙋ нътор Рꙋ дый тоє ж волости Браславъское выгнал, а инъшых выгꙋ билъ, постиналъ и повє шалъ людє й г(о)с(по)д(а)ръских, которых людє й зє мъли тє пє р пꙋ сты лє жать 60 и 4. Нижли имє нъ тыхъ людє й и зє мль ѡному повє дити нє ꙋ мє ли, бо тых всих людє й и ищадцких нє мъцы выстинали" [1, с. 80]. Таксама падрабязна пазначаліся захопы лівонскім бокам зямельных абшараў і азёр ВКЛ. У Браслаўскім павеце было захоплена 41 возера [1, с. 79]. Тэрмін даўнасці некаторых з такіх прыўлашчванняў сягаў да 30 гадоў перад правядзеннем дэмаркацыі 1542 г. [1, с. 64].

Пры параўнанні змен на літвінска-лівонскай мяжы, што адбыліся ў перыяд з 1473 г. да 1542 г., можна адзначыць даволі значнае прасоўванне лівонцаў у паўднёвым напрамку. Характэрна, што захопленыя лівонцамі тэрыторыі ВКЛ не пакідаліся без клопату. У крыніцы паведамляецца пра асаджэнне на іх як падданых Лівоніі, так і выхадцаў з ВКЛ, частка з якіх, верагодна, былі ўцекачамі, арганізацыю гаспадарчай дзейнасці. Далучаныя землі актыўна асвойваліся, на іх ствараліся лівонскія службы з адпаведнай сістэмай павіннасцяў.

Такім чынам, адсутнасць адкрытых ваенных канфліктаў паміж ВКЛ і Лівонскай канфедэрацыяй і існаванне на пэўных этапах нават саюзніцкіх узаемаадносін паміж гэтымі дзяржавамі зусім не гарантавала бяспечнага жыцця жыхарам памежжа. Матэрыялы Кнігі № 560 сведчаць пра наяўнасць дастаткова вялікай колькасці памежных кафліктаў паміж грамадзянамі ВКЛ і Лівоніі у канцы XV – першай палове XVI ст. і імкненне апошняй прасунуць свае межы далей на поўдзень за кошт тэрыторыі ВКЛ.

## Спіс выкарыстаных крыніц

1. Метрыка Вялікага Княства Літоўскага. Кніга 560 (1541 – 1542 гг.). Кніга перапісаў № 3/ Падрыхтоўка тэксту да друку і навуковы апарат: Алег. І. Дзярновіч. 2-е выд. – Мінск: ATHENAEUM, 2010. – 268 с.: іл. 6. (Калекцыя "Помнікі, Том ІІ")

2. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. КМФ-18. Воп. 1. Спр. 560.

3. Российский государственный архив древних актов. Ф. 389. Оп. 1. Ч. 1. Д. 560.